# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*М.А.БЯСПАЛАЯ*

> Нават найпрыгажэйшая зброя ёсць
> злавесны інструмент,
> які ненавісны ўсім жывым істотам.
> *Лао Цзы*

## ВАЙНА І КУЛЬТУРА: ПАРАДОКС УЗАЕМАЗАЛЕЖНАСЦІ

У чым жа заключаецца парадокс ўзаемазалежнасці? На наш погляд, перш за ўсё ў тым, што фізіялагічнае, сацыяльнае, культурнае развіццё чалавека, ператварэнне яго ў homo sapiens, а згодна сучаснай навуцы ў homo sapiens sapiens, а таксама чалавека прыгожага, умелага адбываюцца паралельна з удасканаленнем супрацьстаяння паміж людзьмі – ад яго прымітыўных формаў у першабытным грамадстве да гіперскладаных у сучасным.

З вялікага мноства граней абазначанай праблемы можна выдзеліць найбольш выразныя, такія як ўплыў сацыякультурнага асяроддзя на фарміраванне прычын і перадумоў вайны, такой з'явы, як фарміраванне культуры, ці этыкі, вайны ў пэўных сацыякультурных умовах, а таксама культуры ў вайне і адлюстраванне вайны праз культуру.

Відавочна, што на ўсіх этапах сацыякультурнага развіцця чалавецтва вырашала свае праблемы галоўным чынам сілай. Пры гэтым розум накіроўваўся на распрацоўку і абгрунтаванне стратэгіі і тактыкі ўздзеяння на супрацьлеглы бок. Фактычна ні адна буйная падзея ў гісторыі чалавецтва не адбылася без сілавога рашэння. Першыя гарады адразу пасля іх будаўніцтва абносіліся сценамі, і хаця ад гукаў варожых труб, як гаворыцца ў Біблii, абрушыліся сцены аднаго з іх – Іерыхона, тым не менш людзі былі ўпэўнены ў неабходнасці абароны ад варожых нападаў. Трагічнымі для аўтахтонных насельнікаў былі і першае, і другое вялікія перасяленні народаў.

Сацыякультурны ўзровень развіцця вызначаў і ваенную тактыку, асабліва калі сталі ўзнікаць першыя дзяржавы і з'явілася такое паняцце, як дзяржаўная палітыка з яе пэўнымі мэтамі і задачамі. Для некаторых з іх, напрыклад Асірыі, царства Мітані, імперыі Хань, дзяржавы хетаў, вайна з'яўлялася самым асноўным сродкам вырашэння праблем, галоўным чынам тэрытарыяльных. Прычым ужо ў глыбокай старажытнасці апісанне баявых дзеянняў кожны з бакоў рабіў на сваю карысць. Выразным прыкладам гэтага з'яўляецца апісанне бітвы пры Кадэшы ў 1569 г. да н. э., адзіным героем якой аказаўся егіпецкі фараон, безумоўна, згодна егіпецкага папіруса. Бясспрэчна, што пастаянныя ваенныя дзеянні вымушалі ўдасканальваць ваенную тэхніку, стратэгію і тактыку. Той жа Егіпет быў заваяваны качэўнікамі, таму што егіпецкая армія не мела конніцы, ды і наогул егіпцяне не ведалі каня як жывёлу.

Далейшае сацыякультурнае развіццё прыўносіла новыя аспекты ў ваенную справу. Выразна гэта праявілася ў Старажытнай Грэцыі, калі з'явілася такое паняцце, як ідэалогія. Пад лозунгам "Усё ў імя поліса!" адбываліся вялікія справы, а таксама бясконцыя войны паміж полісамі, у якіх ніколі не заключаўся мір, а толькі перамір'е. Аб'яднаныя адзінай духоўнай культурай, хаця і разрозненыя палітычна, полісы Грэцыі на чале са Спартай і Афінамі змаглі перамагчы магутную Персію. Узнёсласць духу пераможцаў, маральнае захапленне перамогай адлюстраваліся ў стварэнні шэдэўра сусветнай культуры – афінскага Акропаля. Дарэчы, вайну паміж элінамі і персамі можна разглядаць як першае сутыкненне паміж дзвюма цывілізацыямі – еўрапейскай і ўсходняй. У гэтым жа рэчышчы можна разглядаць паходы А.Македонскага, вынікам якіх сталі сінтэз культур Усходу і Захаду і з'яўленне культуры элінізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рымская рэспубліка зрабіла новы крок у развіцці ваеннай справы, таму што яе армія была арміяй грамадзян рэспублікі, а не наёмнікаў, і з гэтай арміяй пад лозунгам “Усё ў імя Рыма!” былі заваяваны новыя землі, а сацыякультурным вынікам сталі раманізацыя заваяваных народаў, пашырэнне рымскай культуры далёка за межы Рыма і Італіі.

У той жа час можна заўважыць і розніцу ў праслаўленні герояў. Калі грэкі ставілі помнікі сваім філосафам, літаратарам, то рымляне – сваім палкаводцам.

Сацыякультурная сітуацыя ў эпоху сярэднявечча паставіла новыя мэты, якія вырашаліся ў асноўным ваеннымі дзеяннямі. Спачатку агульная рымская культура дазваляла капіраваць дзяржаўную структуру Рымскай імперыі, аднак сацыякультурнае развіццё падштурхоўвала да стварэння нацыянальных дзяржаў на захадзе Еўропы. Працэс адбываўся ва ўмовах пастаянных войнаў. Адзіная духоўная культура ўсходнеславянскіх плямёнаў стала галоўнай передумовай працэсу дзяржаўнага развіцця, які адбываўся таксама далёка не мірным шляхам.

Новая гісторыя выклікала і новыя формы ваеннага супрацьстаяння. Перш за ўсё гэта рэвалюцыі і іх спадарожнікі – грамадзянскія войны. Мэту названых формаў стаў вызначаць сацыяльны кампанент, і ідэалогія перамогшага саслоўя станавілася на пэўны час дамінуючай у грамадстве. У поўную сілу сталі праяўляць свой уплыў на сацыякультурную сітуацыю такія складаючыя духоўнай культуры, як палітыка і ідэалогія. У пачатку ХХ ст., калі вайна набыла сусветны характар, ідэалогія кожнай краіны апраўдвала свой удзел у ёй, актыўна фарміравала вобраз ворага і прапагандавала сваіх герояў.

Чалавецтва, развязваючы войны, фактычна заўсёды не магло прадугледзець іх сацыякультурныя наступствы. Адзін з выразных прыкладаў ёсць у нашай гісторыі. У 1399 г. войска Вялікага княжацкіх Літоўскага на чале з вялікім князем Вітаўтам пацярпела страшэнную паразу на р.Ворскла. На полі бою загінулі амаль усе дарослыя прадстаўнікі княжаскіх беларускіх родаў. У аднаго толькі навагародскага князя загінулі чатыры сыны. У выніку атрымалася, што на беларускіх землях не змагла сфарміравацца апазіцыя супраць росту польскага ўплыву і палітыкі вялікага князя, які пасля гэтай трагедыі быў вымушаны падпісаць зусім нявыгадную для нашых земляў адну унію ў 1401 г., а потым другую ў 1413 г.

Бачыліся толькі аптымістычныя пераможныя перспектывы, і ніхто не мог нават думаць, што, напрыклад, у першай сусветнай вайне будзе ваяваць не толькі армія, але і ўся краіна і ўзнікне такая з’ява, як тыл, эканоміка якога будзе поўнасцю працаваць на вайну. Замест мужчын на вытворчасць прыйдуць жанчыны і падлеткі, масавы характар набудзе ўжыванне новай зброі, а таксама з’явіцца цэлае пакаленне, якое ўмела толькі ваяваць. Гэтая апошняя акалічнасць аказала важнейшы ўплыў на фарміраванне пасляваеннай сацыякультурнай і эканамічнай сітуацыі, якая садзейнічала падрыхтоўцы новай вайны.

Другая сусветная вайна ўзнікла, нягледзячы на тое, што ў міжваеннае 20-годдзе, здавалася, рабілася шмат, каб яе пазбегнуць: заключаліся міжнародныя дамовы па абмежаванні і нават забароне войнаў, ствараліся міжнародныя арганізацыі па кантролі за адносінамі паміж дзяржавамі і многае іншае. Аднак пазбегнуць ваеннага канфлікту не ўдалося, а многія і не жадалі гэтага, маючы на ўвазе не толькі блізкія, але і далёкія мэты. Вайна, якая ўзнікла ў верасні 1939 г. і атрымала назву другой сусветнай і ў межах якой адбывалася Вялікая Айчынная вайна народаў СССР супраць кааліцыі фашысцкіх дзяржаў на чале з Германіяй, мела ідэалагічны змест. Менавіта ідэалагічныя патрабаванні прывялі да фарміравання такога аспекту міжнародных адносін, як генацыд, планавае знішчэнне цэлых народаў па расавай ці культурнай прымеце.

Кожная вайна вызначаецца не толькі мэтамі, але і своеасаблівай культурай, ці, больш правільна сказаць, этыкай вайны. На працягу стагоддзяў сфарміравалася правіла “гора пераможаным”, якое ўпершыню было агучана галамі ў 4-м ст. да н. э. і падводзіла вынік вайне. Аднак паступова да гэтага працэсу стала далучацца дыпламатыя і ўсё выразней стаў праступаць прынцып, што гінуць адны, мір заключаюць другія, а карыстаюцца яго вынікамі – трэція. Не заўсёды вынікі вайны бачыліся ў перспектыве. Самы яскравы прыклад – заключэнне мірных дамоў пасля першай сусветнай вайны. Яны стварылі шмат прэцэдэнтаў, якія не былі вырашаны мірным шляхам. І ў новую сусветную вайну было кінута тое пакаленне, якое нарадзілася ў апошнія гады другога дзесяцігоддзя ХХ ст., пасля заканчэння першай сусветнай.

Вядомы прынцып усходнеславянскіх князёў–военачальнікаў, якія папярэджвалі сваіх ворагаў, аб’яўляючы “Іду на вы!”, адлюстроўваў адзін з варыянтаў пачатку баявых дзеянняў. У сярэднявечнай Еўропе склалася своеасаблівая рыцарская ваенная культура з выразным рытуалам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асабліва перад пачаткам бітвы. Вядомы факты, калі ўвесь дзень рыцары варагуючых бакоў саступалі адзін другому права першымі пачаць баявыя дзеянні.

Этыка вайны, яе матэрыяльная культура, як і ваенная стратэгія і тактыка, – катэгоры зменлівыя. Выразна праявілася гэтая акалічнасць у такой ваеннай катэгорыі, як повад для вайны. Безумоўна, яго заўсёды можна знайсці, але 30-я гады XX ст. паказалі, што яго можна стварыць штучна. Прыкладам можа служыць правакацыя, створаная японцамі ў Манчжурыі, ці падобная ж сітуацыя на германа-польскай мяжы ў ноч на 1 верасня 1939 г. і іншыя штучна арганізаваныя прэцэдэнты, якія прывялі да тэрытарыяльных змен напярэдадні другой сусветнай вайны.

Нягледзячы на тое, што вайна несла з сабою смерць і разбурэнне, голад і хваробы, у некаторых выпадках яна разглядалася як нейкая прыгода ў аднастайнасці паўсядзённага жыцця. Напрыклад, напярэдадні аднаго з баёў пад Севастопалем у Крымскую вайну камандаванне воінскай часці запрасіла жыхароў горада паназіраць за яго ходам, і севастопальцы–жанчыны, мужчыны, дзеці – сабраліся на пікнік з адпаведнымі атрыбутамі, каб адначасова захапляцца пераможнымі дзеяннямі рускіх войскаў.

На працягу многіх стагоддзяў фарміраваліся не толькі асобныя віды войскаў, але і іх субкультура. Нават павярхоўны аналіз дазваляе ўбачыць розніцу паміж пяхотай і кавалерыяй, агульнавайсковымі часцямі і гвардыяй, паміж пехацінцамі, лётчыкамі, танкістамі, маракамі і інш. Кожны род войскаў меў не толькі сваю форму, але і сваю паэзію, сваю музыку, свой жывапіс, свае тэатральныя п’есы. Нават паўсядзённае ваеннае жыццё падпарадкоўвалася пэўнаму рытуалу, асабліва выразнаму ў маракоў.

Доўгія стагоддзі жанчыны знаходзіліся па-за межамі ваенных дзеянняў, на іх долю выпадала аплакваць сваіх блізкіх, складаць плачы. Адзін з найбольш вядомых у культуры ўсходніх славян плач Еўдакіі – жонкі Дз.Данскога. Можна прывесці прыклады ўдзелу жанчын у змаганні за незалежнасць радзімы. Тут перш за ўсё нагадаем подзвіг Жанны д’Арк, аднак гэта адзінкавыя выпадкі. Упершыню жанчыны прынялі непасрэдны ўдзел у баявых дзеяннях ў сярэдзіне XIX ст. падчас Крымскай вайны. На полі бою аказвала дапамогу параненым сястра міласэрнасці, англійская арыстакратка Флорэнс Нойцінгейл. Пазней будзе заснаваны медаль у гонар яе імя. Ім ўзнага-роджваліся медыцынскія сёстры, якія аказвалі дапамогу параненым. Сярод шасці беларусак, узнагароджаных гэтым медалём, і Соф’я Кунцэвіч, выпускніца бібліятэчнага факультэта Мінскага педінстытута.

Адзін з кірункаў узнятай тэмы – культура, дакладней, мастацкая культура ў вайне. Як ні парадаксальна, але значная частка самых лепшых твораў розных відаў мастацтва, ды і народнай культуры, прысвечана такім з’явам, як гераізм і трусасць, самаахвярнасць і здрадніцтва, таму што яны найбольш выразна праяўляюцца падчас вайны. Значыць, ёсць патрэба ў чалавецтва праслаўляць любоў да Радзімы на прыкладах ваеннага гераізму і на гэтай аснове фарміраваць духоўнасць грамадства. Яшчэ ў Спарце існаваў своеасаблівы кодэкс паводзін воіна – “На шчыце ці са шчытом”.

У большасці твораў мастацтва праслежваюцца негатыўныя адносіны да войнаў. Адзін з яркіх прыкладаў – апісанне бітвы на Нямізе ў “Аповесці мінулых гадоў”. Мабыць, толькі самым таленавітым даецца магчымасць прадбачыць будучыню, прадказаць яе, як зрабіў гэта Янка Купала ў 1914 г. у наступных радках: “На беразе над ракою шэпчуць вербы з асакою, што-та будзе, што-та будзе, штось трывожны свет і людзі”. Тут выразна адчуваецца перадваенная трывога ў навакольным свеце, якая перадаецца і людзям, і прыродзе. Характарызуючы сацыякультурную сітуацыю напярэдадні другой сусветнай вайны, Анры Барбюс гаварыў, што ствараецца ўражанне, быццам бы ўвесь свет згубіў розум. І рэчаіснасць пацвердзіла гэтую выснову вялікага пісьменніка.

Вайна раскрывае такія глыбіні душы чалавека, што апісанне іх толькі пад сілу генію. Вялікі амерыканец Э.Хэмінгуэй так пісаў аб творы вялікага рускага пісьменніка: «Я люблю “Вайну і мір” за здзіўляючае, глыбокае і праўдзівае адлюстраванне вайны і народа», – хаця і сам у такой жа ступені выразна паказаў пакутлівы лёс чалавека ў вайне ў раманах “Бывай, зброя”, “Па кім звіняць званы”. Жахлівыя наступствы вайны адлюстраваны ў п’есах Б.Брэхта, асабліва “Матушка Кураж і яе дзеці”, трагічны лёс загубленага ваеннага пакалення выразна паказаны ў творчасці Э.М.Рэмарка. Можна назваць яшчэ мноства твораў, у якіх раскрываюцца агіднасць вайны і ў той жа час узнёсласць чалавечага духу. Хто ні ведае шчымлівыя гукі паланэза “Развітанне з Радзімай” ці вальсаў “На сопках Манчжурыі”, “Амурскія хвалі”, марша “Развітанне славянкі” і інш.?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш выразна самыя глыбокія і ўзнёслыя чалавечыя пачуцці і ўчынкі праявіліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, яны адлюстраваны ў шматлікіх шэдэўрах літаратуры, музыкі, выяўленчага і тэатральнага мастацтва. Адзін са знакавых мастацкіх твораў ваеннай эпохі – Сёмая (Ленінградская) сімфонія Дз.Шастаковіча. На самай справе, пад “бомбамі музы не маўчалі”. Кампазітар пісаў: “Нашай барацьбе з фашызмам, нашай перамозе над ворагам, майму роднаму гораду – Ленінграду я прысвячаю сваю Сёмую сімфонію”. У сакавіку 1942 г. яна была выканана аркестрам Вялікага тэатра ў Куйбышаве, потым ў Маскве і Ленінградзе, 19 чэрвеня 1942 г. – у ЗША. Менавіта гэтае апошняе выкананне трансліравалася на ўвесь свет. Дадзены факт з’явіўся адной з прымет таго, што культурныя плыні сталі рухацца насустрач: адышлі на другі план негатыўныя адносіны да многіх падзей савецкай гісторыі 30-х гадоў XX ст., і вялікія дзеячы культуры Захаду выказалі сваю падтрымку бяспры-кладнай барацьбе савецкага народа, гэта з аднаго боку, з другога – савецкая прапаганда змяніла свае адносіны да так званай буржуазнай культуры.

Немалаважнае значэнне мела змена ў адносінах савецкіх афіцыйных колаў да праваслаўнай царквы і гераічнага мінулага народаў, якія насялялі Савецкі Саюз.

Другая сусветная вайна высвеціла такія грані ў паводзінах людзей, якія, безумоўна, сустракаліся і раней, аднак у адзінкавых прыкладах, і якія прадвызначылі перамогу народаў Савецкага Саюза. Самая галоўная з іх – масавы гераізм народа. Чым ён быў абумоўлены? Пытанне няпростае, адказ на яго не можа быць адназначным. У апошні час стала модным гаварыць аб жорсткіх адносінах да салдат, аб загадах па штрафных ротах, загараджальных атрадах, расстрэлах і інш. Мы звернемся да аўтарытэту Дж.Б.Прыстлі, які сцвярджаў, і з гэтым можна пагадзіцца, што “самая жорсткая ў свеце дысцыпліна не здольна прымусіць людзей прыносіць такія ахвяры. Страх не можа прымусіць чалавека праяўляць гераізм. Ён павінен верыць душой і сэрцам у тое, што абараняе”. Менавіта вера і справядлівасць барацьбы за Радзіму, за свае сем’і і хаты натхнялі мільёны сялян, рабочых, настаўнікаў, людзей іншых грамадзянскіх прафесій, апранутых у салдацкія шынялі, на подзвіг. Да месца будзе адзначыць, што фактычна на франтах Вялікай Айчыннай вайны змагаліся цывільныя людзі, таму што больш–менш прафесійная армія была амаль разбіта падчас трагедыі 1941 г. На самай справе К.Сіманаў меў рацыю, калі пісаў аб вызваліцелях так: “...село, освобождавшее Европу”. Менавіта вясковыя людзі, духоўнасць якіх вырастала з народнай культуры, праявілі масавую самаахвярнасць у імя Радзімы. У той жа час якімі асаблівасцямі нацыянальнай культуры і псіхалогіі можна растлумачыць той факт, што нямецкія лётчыкі не зрабілі ніводнага паветранага тарана, нават у небе над Берлінам, ні адзін нямецкі салдат не кінуўся з гранатай пад варожы танк? А ў Чырвонай арміі такія самаахвярныя подзвігі налічваюцца сотнямі.

Па традыцыі на чале войскаў ва ўсе часы былі князі, цары, каралі, імператары. Дарэчы, апошнюю пасаду давалі рымскія воіны найбольш таленавітаму камандзіру, а потым яна набыла дзяржаўны статус. Такі прынцып кіравання не заўсёды апраўдваў сябе. Яго вельмі трапна ахарактарызаваў генерал Д.Скобелеў, сказаўшы аб удзеле імператара Аляксандра II у руска-турэцкай вайне: “Командование было блестящим, но бездарным». Аднак у новы час на полі бою дзейнічалі прафесіяналы, хаця кіраўнікі дзяржаў – прэзідэнты, канцлеры, прэм’еры, генеральныя сакратары партыі – пакідалі за сабою права апошняга рашэння, не заўсёды прадуманага, правільнага і літасцівага да простага салдата, а часцей за ўсё прынятага на эмацыянальным узроўні. Выразна гэта бачна ў дзеяннях савецкага камандавання, асабліва ў першыя месяцы вайны. Толькі калі пагроза навісла над існаваннем самой сістэмы, адышла на другі план ідэя класавай барацьбы, кіраўніцтва дзяржавы і партыі звярнулася да рэлігійных пачуццяў народаў, іх духоўнасці і гераічнага мінулага. З вялікай надзеяй быў сустрэты такі паварот і знайшоў водгук у сэрцах мільёнаў: салдат–франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў, жанчын, дзяцей, фактычна ва ўсім народзе. Патрыятычны ўздым быў настолькі выразным, што, як лічаць некаторыя навукоўцы, калі б не тактычныя пралікі, то вайну можна было б закончыць ужо ў 1943 г.

Падсумоўваючы сказанае вышэй, можна зрабіць выснову аб існаванні пэўнай узаемазалежнасці паміж культурай у самым шырокім разуменні гэтага слова і такой сацыякультурнай з’явай, як вайна. Па-першае, прынцып сілавога рашэння спрэчных пытанняў ужываўся на ўсіх стадыях развіцця чалавецтва; па-другое, узровень культуры пэўнага грамадства вызначаў стратэгію і тактыку вайны; па-трэцяе, вынікам кожнай вайны з’яўляліся выразныя змены ў матэрыяльнай і духоўнай культуры канкрэтнага грамадства ці ўсяго чалавецтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ